Становішча мусульман на беларускіх землях у часы ВКЛ

Лубінскі І.І. (г. Мінск, Беларусь)

Рэлігійная стракатасць Беларусі мае свае карані ў глыбі стагоддзяў. Шлях ад язычніцтва да хрысціянства, распаўсюджванне некалькіх хрысціянскіх канфесій, прыход народаў з нехрысціянскімі рэлігіямі на беларускія землі – гэтыя працэсы адбываюцца да сённяшняга дня. Не з'яўляецца дзіўным і той факт, што ўжо на працягу амаль сямі стагоддзяў на тэрыторыі Беларусі пражываюць і мусульмане.

Пытанне ісламу на тэрыторыі беларускіх земляў вельмі часта ўздымаецца ў сувязі з вывучэннем гісторыі літоўскіх ці беларускіх татар. Менавіта гэты народ, які знайшоў прыхільнасць вялікіх князёў літоўскіх і пачаў сяліцца на беларускіх землях з канца XIV ст., прынёс іслам на ўжо досыць грунтоўна хрысціянізаваныя тэрыторыі. Момант прыходу мусульманаў супаў з распаўсюджваннем каталіцтва ў ВКЛ, асабліва на балцкіх землях. Акаталічванне стала дзяржаўнай палітыкай з часоў Крэўскай уніі і выклікала негатыўную рэакцыю праваслаўнай знаці. Цікава тое, што нейкага негатыву у адносінах да татараў-мусульманаў ў гістарычных дакументах таго часу не назіраецца. Хаця і татарскае рассяленне было дзяржаўнай палітыкай і мела доўгатэрміновы характар. Аднак пэўныя задачы, якія ставіліся перад татарамі ў ВКЛ, і шляхі іх з'яўлення не давалі магчымасці для ісламізацыі княства. Татар прымалі дзеля іх вайсковых здольнасцяў, каб умацаваць войска ВКЛ. А магчымасць пасяліцца на землях ВКЛ для татараў была звязана ці з асабістым запрашэннем, як у выпадка Тахтамыша і іншай татарскай знаці, ці праз прымусовае рассяленне палонных[3,с.12-13]. Таксама павольны рост колькасці татараў на тэрыторыі ВКЛ не ствараў канфліктнай сітуацыі з хрысціянскай большасцю насельніцтва Княства. Не апошнюю ролю у адсутнасці пратэстных настрояў сярод хрысціянаў адыгрываў і пратэкцыянізм вялікіх князёў у адносінах да татараў.

Пакуль не знойдзена дакументаў, якія афіцыйна дазвалялі татарам захоўваць іслам на тэрыторыі ВКЛ, аднак згадкі з XIX ст. сведчаць, што ўшанаванне Вітаўта літоўскімі татарамі звязана і з захаваннем рэлігійнай свабоды[3, с.12].

Самі татары, негледзячы на спрыянне вялікіх князёў, шмат рабілі для захавання сваёй тоеснасці, культуры, а таксама і рэлігіі. Татары вызнавалі іслам суніцкага толка. Аднак першыя пасяленцы на тэрыторыі княства маглі быць і язычнікамі, паколькі ісламізацыя татараў Залатой Арды адбывалася ў сярэдзіне XIV ст., а ёсць ускосныя сведчанні, што менавіта ў той час, пры князі Алгердзе, маглі з'явіцца палонныя татары, якіх рассялялі на землях княства[2, с.126]. Але асноўная плынь рассялення татараў пачалася пры Вітаўце, калі іслам для татараў ужо стаў іх рэлігіяй. Таму захаваць адметнасць стала магчымым толькі захаваўшы сваю

рэлігію. Хутка татары ў сваёй асноўнай массе прынялі старабеларускую мову і беларускія культурныя асаблівасці. Далёка не ўсе ведалі і свабодна карысталіся арабскай мовай, якая ёсць асноўная ў ісламе і неабходная для чытання Карана і малітваў. Тым не менш арабскі алфавіт захоўваўся, нават некаторыя кнігі запісваліся на старабеларускай мове, але арабскім пісьмом. Найбольш вядомымі сярод іх з'яўляюцца Кітабы. Арабская, а пазней і турэцкая мова стала асновай рэлігійнай адуацыі сярод татараў з XV ст. Доўгі час запрашалі настаўнікаў, імамаў з Крымскага ханства[2, с.123].

Ёсць аднак згадкі пазнейшых часоў, якія сведчаць аб выкарыстанні татарскай тэмы у рэлігійнай палітыцы вялікіх князёў. Так, ў сярэдзіне XV ст. вялікі князь Казімір, звяртаючыся да папы рымскага па накіраванне манахаў з ордэна бернардынцаў на вялікакняскія землі, звяртаў увагу на місійны характар гэтага ордэна і неабходнасць яго ўсходняй місіі для навяртання не толькі праваслаўных, але і татараў-мусульман. Гэтая аргументацыя была з большага прапагандай, пра што сведчыць адсутнасць якіх-небудзь згадак пра хрысціянізацыю мусульман бернардынцамі пасля іх прыходу на беларускія землі[4, s.71-72].

Сустракаюцца згадкі пра рэлігійную свабоду для татараў-мусульман і ў пазнейшыя часы. Такімі з'яўляюцца сведчанні іншаземных паслоў другой паловы XVI ст. пра тое, што ў ВКЛ сярод католікаў і праваслаўных спакойна пражываюць і мусульмане[4, s.72]. Аднак сітуацыя змянялася не на карысць мусульман. Прыход у 1570 г. езуітаў разам з утварэннем Рэчы Паспалітай сталі паваротнымі пунктамі ў становішчы мусульман у ВКЛ. Хаця езуіты большасць сваіх намаганняў накіравалі на вяртанне пратэстантаў у каталіцтва і на ўніяцкі праект для праваслаўных, аднак іх актыўнасць садзейнічала і рэлігійнаму ціску на іншыя веравызнанні. Адным з падцвярджэнняў гэтага стаў малітоўнік 1591 г., які меў паралельна з польскім тэкстам арабскі і турэцкі. Аднак невядома, наколькі ён быў распаўсюджаны і як паўплываў на хрысціянізацыю татараў[4, s.73]. Таксама езуіты выкарыстоўвалі сваю адукацыйную палітыку, каб навяртаць у т.л. мусульман у каталіцтва. І хоць канкрэтна гэта місія не ўдалася, аднак планы па хрысціянізацыі татар не спыніла.

Большы ўплыў мела дзяржаўная палітыка уладаў Рэчы Паспалітай, якая ад свабоды веравызнанняў хутка перайшла да ўстанаўлення адзінай веры. Таксама контррэфармацыйныя настроі дзяржавы ўзмацнілі міжрэлігійныя дыскусіі, звілася супраціўленне іншаверцам, у т.л. мусульманам. Сведчаннем гэтага з'ўляецца факт разбурэння мячэці ў Троках у 1609 г. падчас бунту "супраць жыдоў і дысідэнтаў". Аднак агульныя настроі грамадства часцей былі на баку мусульман, бо тагачасныя жыхары ВКЛ лічылі татараў бясшкоднай групай[4,s.74].

У XVII ст. ціск на мусульман узмацнілі і каталіцкія ўлады. Так, віленскі біскуп Бенедыкт Война не дазваляў ні аднаўляць, ні будаваць мячэці. Так цягнулася да 1766 г, калі дазволілі рамантаваць мячэці, а ў

1775 г. – будаваць новыя. На момант трэцяга падзелу Рэчы Паспалітай у ВКЛ заставалася 23 мячэці і 65 малітоўных дамоў[1, с.163-164].

Часам сустракаюцца згадкі пра абвінавачванне татараў у чарадзействе. У пазнейшых даследаванннях маецца згадка пра “Апалогію татараў”, якую напісаў татарын Азулевіч у 1630 г. і якая цалкам пакуль не знойдзена. У гэтай працы аўтар абараняе права татараў насіць залатыя і срэбныя ўпрыгоджванні арабскага паходжання з надпісамі. А менавіта гэтыя надпісы некаторыя лічылі магічнымі ці сатанінскімі[4,s.79]. Наступствы такіх адносін прывялі да дыскрымінацыі татар. Некалькі пасяленцаў-татар было спалена, забаранялі жаніцьбу на хрысціянках. Многія з’ехалі ад рэлігійнага і сацыяльнага ўціску ў Асманскую імперыю[1, с.164].

Таксама важную ролю адыгрывала моўная і культурная асіміляцыя. Татары перажылі да XVI ст. прыняцце старабеларускай мовы і культуры, а са з’яленнем Рэчы Паспалітай падвяргаліся паланізацыі. Адарванне ад абшчыны праз імкненне да кар’ернага росту, міжканфесійныя шлюбы, якія дазволены ў ісламе, спрыялі пераходу часткі татараў ў адну з хрысціянскіх канфесій. Пры гэтым яны канчаткова гублялі сувязь з татарскай абшчынай і ўжо ў другім, трэцім пакаленнях ніяк не адрозніваліся ад карэннага насельніцтва. У выніку ў Рэчы Паспалітай з 200 тыс. татар у сярэдзіне XVI ст. на пачатак XVIII ст. засталося каля 30 тыс[1, с.163-164].

Такім чынам, мусульмане ў ВКЛ перажылі рознае стаўленне да сябе: ад рэлігійнай свабоды часоў Вітаўта да контррэфармацыйнага ціску ў Рэчы Паспалітай. Гэта, аднак, паспрыяла кансалідацыі татар-мусульман на нашых землях, якія змаглі захаваць сваю самабытнасць, культуру і сталі складовай часткай беларускага народа.

Літаратура

1. Думін, С.У., Канапацкі, І.Б. Беларускія татары: мінулае і сучаснасць / С.У.Думін, І.Б. Канапацкі. – Мінск: Полымя, 1993. - 206 с.: іл.

2. Захаркевіч, С.А. Роля ісламу ў культурнай адаптацыі татар на беларускіх землях у XVI-XVIII стст. / С.А.Захаркевіч. // «Trzeba dyscypliny – bez niej nie da się pasji składnie wyrazić...». Studia z dziejów nowożytnych (XVI–XVIII w.) / pod red. M. Foryckiego, A. Perłakowskiego, F. Wolańskiego.– Poznań: IHUAM, 2012. – С. 121–128.

3. Канапацкі, І. Беларускія татары. Гістарычны лёс народа і культуры / І. Канапацкі // Мы з Іманам жывём на зямлі Беларусі: беларускі татарын Якуб Якубоўскі / уклад.: І.П. Драўніцкі, Т.В.Якубоўская. – Мінск: Тэхналогія, 2015. – С. 11-16.

4. Konopacki, A. Życie religijne Tatarów na ziemiach Wielkiego Księstwa Litewskiego w XVI-XIX wieku / A. Konopacki. – Warszawa: Wydawnictwa Uniwersytetu Warszawskiego, 2010. – 253 s.